РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 ЛЮТАГА 2007 г. ЧАЦВЕР
№ 21 (25886)
Кошт 350 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

### РАЎНІВІЦА ПАДПАЛІЛА ДОМ

**Пракуратурай Барысаўскага раёна ўзбуджана крымінальная справа ў адносінах да вясковай жыхаркі, якая, як мяркуецца, не пашкадавала ўласны дом, падпаліўшы яго, каб пакараць мужчыну з жанчынай, што знаходзіліся ў будынку.**

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, у ходзе расследавання крымінальнай справы па факту гібелі ў вёсцы Осава мясцовай жанчыны, было ўстаноўлена, што руку да гэтага прыклала рабочая аднаго з сельгасвытворчых кааператываў. Апошняя, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення, з рэўнасці падпаліла свой дом, у якім спалі няшчасная і 50-гадовы мужчына. Мужчына, выбіўшы шыбу, змог выбрацца з палаючага будынка, жанчына — не. Вясковая жыхарка, якая падазраецца ў злачынстве, арыштавана.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### «ЕЎРАНЬЮС» ПА-БЕЛАРУСКУ

**Сёння міжнароднаму спадарожніковаму тэлеканалу «Беларусь-ТБ» спаўняецца 2 гады. І дасягненні на гэтым рубяжы даволі значныя. Так, напрыканцы 2006 года ў 6 буйных гарадах РФ быў праведзены комплекс сацыялагічных даследаванняў. Іх вынікі сведчаць, што па тыднёваму ахопу аўдыторыі «Беларусь-ТБ» дзеліць 15—16-е месца з вядомым каналам «Euronews» і ўваходзіць у топ-20 тэлеканалаў Расіі.**

Да дня нараджэння канал падрыхтаваў новае афармленне. Акрамя таго, у гэтым годзе плануецца перавесці «Беларусь-ТБ» на вышы спадарожнік — «Экспрэс-АМ22», што істотна павялічыць тэрыторыю вяшчання. Не за гарамі і стварэнне ўласных выпускаў навін і аналітычных праграм (зараз, нагадаем, эфір канала складаецца з лепшых узораў прадукцыі ўсіх айчынных тэлевытворцаў).

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

### ЗАХОЎВАЛА БАБУЛЯ СПІРТНОЕ

**Больш чым паўтоны спіртазмяшчальнай вадкасці канфіскавана ў кватэры сталічнай пенсіянеркі. Акрамя алкаголю, у 69-гадовай жыхаркі дома № 146 на праспекце Ракасоўскага выяўлена больш за 200 коркаў і 130 этыкетак на гарэлку і каньяк завода «Мінск-Крышталь».**

Кошт спіртнога — прыкладна чатыры з паловай мільёны рублёў. Каментуючы сітуацыю, начальнік упраўлення ўнутраных спраў Ленінскага раёна Уладзімір Рудзішкін адзначыў, што канфіскацыя такой буйной партыі кантрафактнай алкагольнай прадукцыі — вялікая рэдкасць, а вось нелегальных гандляроў спіртным затрымліваюць рэгулярна. Як правіла, гэта людзі сталага ўзросту, якія рэалізоўваюць таннае віно і самагонку ў начны і вячэрні час, калі магазіны ўжо не працуюць. Уладзімір Рудзішкін падкрэсліў, што ў такіх выпадках прадукцыя канфіскуецца, а ў адносінах да прадаўца складаецца адміністрацыйны пратакол.

**Кацярына ГУСЕВА, «Мінск—Навіны».**

### ГАЗ З НЕТРАДЫЦЫЙНАЙ СЫРАВІНЫ

**Будаўніцтва біягазавага энергетычнага комплексу па нямецкай тэхналогіі вядзецца ў рэспубліканскім унітарным сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Заходні» Брэсцкага раёна. У спецыяльных ёмістасцях будзе выпрацоўвацца біягаз.**

Такая тэхналогія атрымання паліва шырока распаўсюджана на Захадзе. Энергію атрымліваюць пры сцісканні біягазу. Апошні вылучаюць з біялагічнай масы, у склад якой уваходзяць харчовыя і раслінныя астаткі, адходы мясакамбінатаў і падобнай вытворчасці. У «Заходнім» у якасці біямасы будуць выкарыстоўваць гной са свінакомплексу. Атрыманай энергіі павінна хапіць на асвятленне і ацяпленне прадпрыемства на вырошчванні свіней.

**Яна СВЕТАВА.**

## Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі дасягнулі $1 млрд 753 млн...

**Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч, з 15 снежня мінулага года па 22 студзеня гэтага штодзённы попыт беларусаў на наяўную валюту перавышаў прапанову (як гэта было, напрыклад, у кастрычніку ці лістападзе) у... 4—5 разоў. Аднак дэфіцыту СКВ на ўнутраным рынку не назіралася: галоўны банк паклапаціўся пра гэта.**

Каментуючы даныя «феномен», кіраўнік Нацыянальнага банка заначыў, што ў многім ажыятаж тлумачыцца тым, што не былі ўрэгуляваны пытанні па пастаўцы энерганосьбітаў у краіну, па цэнах на іх. Да таго ж людзей прывялі да «абменнікаў» і чуткі аб магчымай дэнамінацыі беларускага рубля. Аднак на сёння сітуацыя ўжо стабілізавалася. Пра што, дарэчы, сведчаць і апошнія даныя па росту дэпазітаў насельніцтва ў беларускіх банках: з 1 па 29 студзеня яны павялічыліся на 68,2 мільярда рублёў.

Паводле слоў Пятра Пракаповіча, летась грашова-крэдытная палітыка, як і ў папярэднія гады, была накіравана на стварэнне ўмоў для выканання прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Па некаторых прагнозных паказчыках прагноз быў нават больш «песімістычны» ў параўнанні з тым, чаго ўдалося дасягнуць. Так, індэкс спажывецкіх цэн склаў усяго 106,6 працэнта: у параўнанні з 2005 годам цэны летась раслі ў 1,2 раза марудней, з 2004 — у 2,2 раза. Гэта значыць, што за 2 гады індэкс спажывецкіх цэн знізіўся больш чым у 2 разы. Такім чынам, паказчык стабільнасці цэн у Беларусі за апошнія два гады забяспечваецца ў поўным аб'ёме. Раслі таксама залатавалютныя рэзервы рэспублікі. Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі ў нацыянальным выражэнні на 1 студзеня гэтага года дасягнулі 1 млрд 753 млн долараў ЗША. Яны павялічыліся, напрыклад, з 1 студзеня 2005 года ў 1,7 раза. Міжнародныя рэзервовыя актывы краіны ў міжнародным вызначэнні выраслі ў 1,1 раза да мінулага года, і за 2 гады — у 1,8 раза. Залаты ж запас за апошнія два гады ў фізічным аб'ёме павялічыўся на 4972,2 кг. Значна ўзрасло і крэдытаванне банкамі эканомікі, насельніцтва: напрыклад, запазычанасць насельніцтва па крэдытах на фінансаванне жылля, выдадзеных па льготных падставах, узрасла ў 1,5 раза, а на спажывецкія мэты — у 2 разы.

Сёлета, падкрэсліў Пётр Пракаповіч, Нацбанк захавае паслядоўнасць грашова-крэдытнай палітыкі, што праводзілася раней, гэта значыць яе стратэгічную накіраванасць на стварэнне ўмоў для ўстойлівых тэмпаў эканамічнага росту. У прыватнасці, з дапамогай манетарных інструментаў і мераў эканамічнай палітыкі будзе праводзіцца шмат намаганняў на забеспячэнне зніжэння інфляцыі ў рамках прагнозных параметраў, каб не перавысіць запланаваны ўзровень у 6—8 працэнтаў.

Закранаючы пытанне пра адзіную валюту Беларусі і Расіі, галоўны банкір адзначыў, што апошнія дзеянні нашых расійскіх калег прывялі да таго, што пытанне аб тэрмінах яе ўвядзення адсоўваецца на няпэўны тэрмін. «Да таго часу, пакуль не будзе створана адзіная эканамічная прастора, адзіная мытная прастора, роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання і насельніцтва, увядзенне адзінай валюты нерэальна і немагчыма», — заначыў Пётр Пракаповіч.

Дарэчы, калі размова зайшла пра тое, ці плануецца і далей павялічваць стаўку рэфінансавання, кіраўнік Нацбанка сказаў, што да канца года яна павінна скласці 7—9 працэнтаў гадавых, як запланавана ў прагнозе. Аднак Пётр Пракаповіч таксама адназначна не сцвярджае, што павышэнне стаўкі з 1 лютага на 1 працэнт — апошняе. Праўда, паводле яго слоў, падстаў для далейшага павышэння стаўкі пакуль няма. «Спадзяёмся, што і не будзе», — падкрэсліў ён.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что 7 февраля 2007 года ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

Место проведения: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

**Повестка дня:**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании — 31 января 2007 года.

*Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в учреждения ОАО «Белагропромбанк» по месту нахождения акционеров.*

Дата окончания приема бюллетеней для заочного голосования – 5 февраля 2007 года.

***С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 16 февраля 2007 года.***

**Телефон для справок: 8(017)2285303.**

ISSN 1990-763X
9 771990 763008

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.02.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 140,00 |
| 1 еўра | 2 768,20 |
| 1 латвійскі лат | 3 974,74 |
| 1 літоўскі літ | 801,69 |
| 1 чэшская крона | 97,82 |
| 1 польскі злоты | 703,90 |
| 1 расійскі рубель | 80,61 |
| 1 украінская грыўня | 423,32 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 26,5484 |
| 10 UAH | 52,3823 |
| 1000 BYR | 12,3467 |
| EUR | 34,3802 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 31.01.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2210 / 2325 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*Уладзімір КАНАПЛЁЎ:*

## «Дэпутаты плануюць павялічыць дапамогу пры нараджэнні дзяцей»

**Дэмаграфічная праблема з'яўляецца сёння ў Беларусі адной з самых актуальных. Для таго, каб беларусы захаваліся як нацыя, іх павінна быць хоць бы ў два разы больш, чым цяпер. Аб гэтым заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Канаплёў на сустрэчы з дэлегатамі другога з'езда Садружнасці студэнцкіх і маладзёжных арганізацый.**

«Беларусь па тэрыторыі ўсяго ў паўтара раза меншая за Германію. Але насельніцтва ў нас менш у 8,5 раза», — адзначыў парламентарый. Доля сем'яў з адным дзіцем у Беларусі складае 59 працэнтаў. Таму Беларусь першая на постсавецкай прасторы прыняла Закон аб дэмаграфічнай бяспецы. Усяго за 10 гадоў парламентам прынята 15 законаў у сферы аховы сям'і, мацярынства і дзяцінства. У выніку ў краіне ствараецца сістэма дзяржаўнай падтрымкі маладой сям'і. Гэта і грашовая дапамога, і розныя льготы.

Уладзімір Канаплёў паведаміў, што ў Палату прадстаўнікоў паступіў праект, які прадугледжвае павелічэнне дапамогі да 5 бюджэтаў пражытковага мінімуму пры нараджэнні першага дзіцяці, а пры нараджэнні другога і наступных — да 7 бюджэтаў пражытковага мінімуму. На думку спікера, пазітыўныя зрухі ўжо ёсць. Павялічваецца колькасць шлюбаў, зменшылася колькасць разводаў. У 2006 годзе ўпершыню за 17 гадоў адзначаны рост нараджальнасці.

«Мы разумеем, што матэрыяльная дапамога нашым маладым сем'ям не можа параўнацца з тым, што робіць сёння, напрыклад, Расія. Але каб даваць больш, трэба развіваць эканоміку, пераводзіць яе на інавацыйныя рэйкі, таму што гэта новыя магчымасці для моладзі», — лічыць Уладзімір Канаплёў.

**Наталля ІЛЬЧОВА, БЕЛТА.**

## У Беларусі магчыма павышэнне ўнутраных цэн на нафтапрадукты да 5 працэнтаў

**Аб гэтым паведаміў намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахім» Міхаіл Асіпенка ўчора на сустрэчы з журналістамі.**

Ён адзначыў таксама, што акрамя гэтага павышэння да канца года змяненне цэн больш не плануецца, «калі не будзе якіх-небудзь форс-мажорных абставінаў». Цяпер асобныя грамадзяне зарабляюць на вывазе нафтапрадуктаў з Беларусі ў суседнія краіны, асабліва ў Літву і Латвію. Белнафтахім не будзе «патураць гэтаму бізнэсу», цэны прыкладна ўраўнуюцца.

Беларусь у лютым будзе атрымліваць нафту па новай цэнавай формуле. Ён растлумачыў, што «гэта тая ж формула, па якой купляюць нафту ва ўсім свеце з розніцай у кошце транспарціроўкі». Беларусь гарантавана будзе закупляць нафту як мінімум на $130 танней, чым яна абыходзіцца палякам і іншым спажыўцам расійскай нафты за мяжой. Згодна з разлікамі, сярэдняя цана паставак для Беларусі складзе $225 за 1 тону.

Беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы будуць працаваць прыбыткова. Канцэрн «Белнафтахім» працуе над стварэннем нафтатрэйдэрскай кампаніі. Два нафтаперапрацоўчыя заводы, Беларускі нафтавы гандлёвы дом і ВА «Беларуснафта» створаць аб'яднаны статутны фонд і адкрыюць прадпрыемства на тэрыторыі Заходняй Еўропы.

**Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.**

Ва ўрадзе

## Праект Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі будзе разгледжаны на нарадзе ў Прэзідэнта

**Аб гэтым паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр Косінец.**

Пры распрацоўцы дакумента ўсе канцэптуальныя падыходы ўзгадняліся з Прэзідэнтам Беларусі. Палажэнні праекта праграмы неаднаразова разглядаліся ў Савеце Міністраў, шырока абмяркоўваліся ў грамадстве, сказаў віцэ-прэм'ер.

У мэтах пераадолення працэсу дэпапуляцыі ў Беларусі праводзіцца інтэнсіўная работа па трох асноўных напрамках: павышэнне нараджальнасці, зніжэнне смяротнасці і аптымізацыя міграцыйных працэсаў. Як вынік, намеціліся станоўчыя дэмаграфічныя тэндэнцыі. Так, у рэспубліцы ў мінулым годзе нарадзілася на 5,4 тыс. чалавек (на 6,4 працэнта) больш, чым у 2005 годзе. Колькасць памерлых знізілася ў параўнанні з 2005 годам амаль на 3,4 тыс. чалавек (на 2,4 працэнта). У мінулым годзе дадатнае сальда міграцыі склала амаль 5,7 тыс. чалавек.

Стабілізацыі дэмаграфічных працэсаў садзейнічае рэалізацыя мерапрыемстваў прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі». Станоўчую ролю адыгрывае «водгук грамадства на тую матывацыю, якая створана ў дзяржаве для стымулявання нараджальнасці», сказаў Аляксандр Косінец.

У Беларусі будзе прадоўжана работа па аптымізацыі міграцыйных працэсаў, паведаміў Аляксандр Косінец.

У першую чаргу размова ідзе аб стварэнні ўмоў для вяртання на радзіму этнічных беларусаў. Цяпер праводзіцца значная работа па падрыхтоўцы праекта закона «Аб суайчынніках, якія пражываюць за мяжой». У Савеце Рэспублікі створана спецыяльная група, якая займаецца гэтым пытаннем, сказаў Аляксандр Косінец.

Сёння больш як 3 млн этнічных беларусаў пражываюць за мяжой. «Мы будзем вітаць вяртанне суайчыннікаў на родную зямлю», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Міграцыйныя працэсы маюць даволі высокае дадатнае сальда. «У 2006 годзе гэты паказчык перасягнуў 5 тыс. чалавек», — сказаў на заканчэнне Аляксандр Косінец.

**Жанна КАТЛЯРОВА, БЕЛТА.**

## У адной касе білеты і на аўтобус, і на цягнік, і на самалёт

Нацыянальнай авіякампаніяй «Белавія» распрацавана і са снежня мінулага года на авіярэйсе Мінск—Лондан тэсціруецца тэхналогія продажу «Электроннага білета». Павышаецца якасць абслугоўвання пасажыраў пры продажы і браніраванні білетаў.

Усяго за мінулы год Міністэрствам транспарту і камунікацый на навукова-даследчыя работы са сродкаў інавацыйнага фонду і рэспубліканскага дарожнага фонду было накіравана 8,8 млрд рублёў. Сярод іншых найбольш значных навуковых распрацовак у галіне транспарту і дарожнай гаспадаркі варта, напрыклад, адзначыць спецыяльную камп'ютарную сістэму цэнтралізаванага продажу білетаў на праезд у пасажырскім транспарце. Пасля яе завяршэння пасажыры змогуць загадзя набываць за наяўны і безнаяўны разлікі білеты на любыя аўтобусныя маршруты, што будуць адпраўляцца з усіх аўтавакзалаў і аўтастанцый краіны, уключаных у сістэму. У далейшым яна будзе злучана з аналагічнымі сістэмамі, якія маюць Беларуская чыгунка і Дэпартамент па авіяцыі, што дазволіць у адной касе набываць або браніраваць білет на любы від пасажырскага транспарту ў Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Колькасць Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі скарочана на 5 адзінак

Прэзідэнт Беларусі прыняў рашэнне аб скарачэнні колькасці сваёй Адміністрацыі на 5 адзінак і падпісаў адпаведны ўказ.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**БЕЛПРОМСТРОЙБАНК**
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

**ОАО «Белпромстройбанк» устанавливает с 01 февраля 2007 г. следующие процентные ставки по вновь привлекаемым депозитам физических лиц в иностранной валюте:**

1.Срочный банковский депозит на 4 месяца в иностранной валюте «К отпуску»

| Срок привлечения | Сумма депозита, дополнительного взноса | Процентная ставка (годовая) Доллары США, евро |
|---|---|---|
| 4 месяца | любая | 6 |

2.Срочный банковский депозит в иностранной валюте «Дифференцированный доход»

| Срок привлечения | Сумма депозита | Шкала процентных ставок (годовых) Доллары США, евро | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | за 1-й | за 2-й | за 3-й | за 4-й | за 5-й | за 6-й |
| 6 месяцев | любая | 2 | 3 | 4 | 6 | 8 | 10 |

3.Срочный банковский накопительный депозит с капитализацией в иностранной валюте

| Срок привлечения | Сумма депозита, дополнительных взносов | Процентная ставка (годовая) | |
|---|---|---|---|
| | | Долары США, евро | Российский рубль |
| 3 месяца | любая | 4 | 5 |
| 6 месяцев | | 5 | 6 |
| 1 год | | 7,5 | 8 |
| 2 года | | 8 | 8,5 |
| 3 года | | 8,5 | 9 |

шкала процентных ставок при досрочном востреовании депозита

| Период размешения до даты востребования | Процентная ставка (годовая) | |
|---|---|---|
| | Долары США, евро | Российский рубль |
| до 3 месяцев | ставка текущих счетов физических лиц * | ставка текущих счетов физических лиц * |
| от 3 месяцев до 6 месяцев | 3 | 4 |
| от 6 месяцев до 1 года | 5 | 5 |
| от 1 года до 2 лет | 6 | 6,5 |
| от 2 лет | 7,5 | 8 |

4.Срочный банковский депозит на 1 год в иностранной валюте «Динамичный»

| Срок привлечения | Сумма депозита дополнительного взноса | Процентная ставка (годовая) | |
|---|---|---|---|
| | | Долары США, евро | Российский рубль |
| 1 год | любая | 7,5 | 7,5 |

**Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «Белпромстройбанк» или по телефону в г.Минске 289-46-06.**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 27.10.2006 года на осуществление банковской деятельности.*

*Возврат средств физических лиц в ОАО «Белпромстройбанк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.*

# «КРАІНА ЗДАРОЎЯ»



*Міністр інфармацыі Уладзімір РУСАКЕВІЧ, міністр спорту і турызму Аляксандр ГРЫГАРАЎ і намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Ніна ГАЎРЫЛАВА пагасілі новыя паштовыя канверты, выпушчаныя да выставы.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Учора ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭКСПА» (пр. Пераможцаў, 14) адбылася афіцыйная цырымонія адкрыцця III міжнароднай спецыялізаванай выставы «Тыдзень моды на здароўе», у якой бярэ ўдзел і наша газета.**

— Вітаю вас у самым чыстым і здаровым горадзе на планеце, — звярнуўся да прысутных міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў. — Здаровы лад жыцця і яго галоўны кампанент — фізічная культура і спорт — выконваюць вялікую ролю ў станаўленні магутнай, моцнай дзяржавы і здаровага грамадства, таму і Прэзідэнт, і ўрад нашай краіны ўдзяляюць вялікую ўвагу стварэнню ўмоў для заняткаў спортам і фізічнай культурай: у Беларусі дзейнічае звыш 25 тысяч спартыўных пабудоў. Напрыклад, нядаўна ўзведзены Лядовы палац у Жлобіне. Неўзабаве ў сталіцы будзе ўнікальная арэна «Мінск», разлічаная на 20 тысяч гледачоў і для заняткаў 30 відамі спорту.

Падзяку за ўклад у фармаванне здаровай нацыі беларускім журналістам выказаў міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч:

— Прапаганду здаровага ладу жыцця супрацоўнікі сродкаў масавай інфармацыі ўспрымаюць як адну са сваіх галоўных задач, таму на старонках перыядычных выданняў, у тэле- і радыёэфіры гэта тэма прысутнічае пастаянна і асвятляецца вельмі таленавіта. Хачу выказаць падзяку і расійскім калегам, якія адгукнуліся на прапанову ўзяць удзел у гэтай выставе. Жадаю ўсім здароўя на многія гады!

Пасля сваіх выступленняў Уладзімір Васільевіч і Аляксандр Уладзіміравіч пагасілі новыя паштовыя канверты, якія «Белпошта» выпусціла спецыяльна да выставы «Тыдзень моды на здароўе», а трохразовы алімпійскі чэмпіён Аляксандр Мядзведзь перарэзаў сімвалічную стужку, пасля чаго вырашыў папрачацца з людзьмі, якія прыдумалі назву выставы: «Па-мойму, моды на здароўе быць не павінна, бо сачыць за здароўем трэба заўжды, абавязкова, таму штодзённа займайцеся спортам».

Да прыхільнікаў здаровага ладу жыцця, канешне ж, мае дачыненне і «Звязда», таму на стэндзе нашай газеты была і своеасаблівая лазня з венікамі, і свежы нумар з укладкай «Краіна здароўя». Выступіць на нашай прэзентацыі з задавальненнем адгукнуліся і нашы даўнія сяброўкі — дзяўчаты з ансамбля эстраднага танца «Глорыя» ліцэя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Чытачы «Звязды» не толькі з ахвотай паглядзелі на іх танцы, але і атрымалі прэзенты з сімволікай «Звязды», што ў юбілейны для нашага выдання год (сёлета «Звяздзе» спаўняецца 90) — цудоўны падарунак.

**Ірына ПРЫМАК.**



*Выступаюць даўнія сяброўкі «Звязды» — ансамбль эстраднага танца «Глорыя».*

## Не каманды, а асабісты прыклад

У рамках выставы «Тыдзень моды на здароўе» ў Мінску прайшла сустрэча міністра спорту і турызму РБ Аляксандра Грыгарава з журналістамі Беларусі і Расіі, на якой ішла размова аб масавым фізкультурна-аздараўленчым руху. Сталі традыцыйнымі рэспубліканскія масавыя фізкультурна-спартыўныя спаборніцтвы «Мінская лыжня», «Мінская восень» з удзелам кіраўніка дзяржавы, «Залатая шайба» і «Скураны мяч». Наогул фізічнай культурай і спортам у нашай краіне займаецца 12,6 працэнта грамадзян ад агульнай колькасці насельніцтва (1 мільён 236 чалавек). Для параўнання — у Расіі гэты паказчык складае 12 працэнтаў, а ва Украіне — 11.

Паводле слоў Аляксандра Уладзіміравіча, каманднымі метадамі нікога аздараўляцца і займацца спортам не прымусіш, а толькі асабістым прыкладам: «Я два разы на тыдзень плаваю ў басейне, спрабую зазірнуць у лазню і на більярд. Летам магу прабегчы кіламетры тры побач з домам, а зімою станаўлюся на лыжы, ды і кіраўнік нашай краіны сваім прыкладам паказвае нам, як трэба сябраваць са спортам».

**Ірына ПРЫМАК.**

## ЧАЛАВЕК З САМЫМІ МОЦНЫМІ ЛЁГКІМІ

Мінчаніну Мікалаю Куліку — 59 гадоў, ён працуе дырэктарам ТДА «ПРС». Пра выставу «Тыдзень моды на здароўе» пачуў, можна сказаць, выпадкова — завітаў, паглядзеў і нават выйграў у адным са «звяздоўскіх» конкурсаў. Высветлілася, што пра здаровы лад жыцця Мікалай Мікалаевіч ведае не па чутках.

— Я за ўсё жыццё не выкурыў ніводнай цыгарэты, ды і іншым таксама не раю. Быў аднойчы перыяд — служыў у арміі, атрымаў ад дзяўчыны не вельмі прыемны ліст, прыйшоў да хлопцаў засмучаны ў курылку. Толькі ўзяў гэтую цыгарэту... і адразу выкінуў. Гарэлкі таксама не піў, максімум па святах куфаль піва. Затое сябрую са спортам: за гэтую зіму ўжо тройчы бегаў на лыжах. Раней паматарску займаўся футболам, баскетболам і г.д. І жонка, і сын з дачкой таксама падтрымліваюць актыўны лад жыцця.

Сакрэт здароўя, лічыць Мікалай Мікалаевіч, просты. Усяго і трэба — рух, добры сон, збалансаванае харчаванне, каханне і праведнае жыццё, каб табе з людзьмі і людзям з табой было добра. Чаго ён і пажадаў усім чытачам «Звязды», а нам дадаткова павелічэння тыражу.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Візавыя клопаты не пакідайце на потым

**Польшча, бадай, самая наведваемая нашымі суайчыннікамі замежная краіна, з якой у Беларусі ўсталяваны візавы адносіны. Аб візавых выніках мінулага года, захадах па вырашэнню праблем у гэтай сферы, наватўвядзеннях у практыцы выдачы віз ішла размова на нядаўняй прэс-кафэрэнцыі ў польскім пасольстве.**

Так, паводле даных начальніка консульскага аддзела пасольства Польшчы ў Мінску Кшыштофа Свідэрака, у 2005 годзе польскую візу перасеклі 3 650 802 грамадзяніны Беларусі, а летась — 3 911 766. У выдачы візы было адмоўлена толькі каля 300 грамадзянам. Паводле назіранняў консулаў, у асноўным у Польшчу едуць з мэтай наведаць сваякоў, сяброў, таксама туды імкнуцца дзелавыя людзі, турысты і аматары шопінгу.

У мінулым годзе самы напружаным месяцам стаў жнівень, калі консулам даводзілася працаваць у вельмі напружаным рэжыме. Таксама «гарачыя» ў гэтым сэнсе — кастрычнік і снежань, чэрвень і красавік.

З гэтай нагоды польскія дыпламаты настойліва раяць клапаціцца аб візе загадзя. Там больш што атрымаць яе можна задоўга да паездкі — амаль за шэсць месяцаў да даты ўезду ў Польшчу. Таму, каб пазбегнуць чэргаў і іншых непрыемных сюрпрызаў, лепш здаваць дакументы на атрыманне візы ў студзені, лютым і сакавіку.

Але чамусьці большасць тых, хто збіраецца ехаць летам, менавіта летам і звяртаюцца з пытаннем атрымання візы. Адсюль і сапсаваныя ў доўгіх чэргах нервы, і скаргі, і злоўжыванні. Асабліва складаней была сітуацыя ў Мінску, калі атрыманне візы часам ператварылася для тысяч людзей ў даволі пакутлівы працэс.

На думку начальніка візавага аддзела пасольства Міхала Грачылы, свой сумны ўклад у гэту справу ўнеслі некаторыя нядобрасумленныя беларускія турфірмы, якія ўводзілі ў зман супрацоўнікаў консульства заяўкамі і просьбамі аб паскарэнні выдачы віз для быццам бы ўдзельнікаў запланаваных на канкрэтныя даты паездак груп турыстаў. А на самай справе турфірмы потым прадавалі месца ў чарзе з выгадай для сябе. Часта за візы турфірмы дадаткова брали з людзей немалыя грошы. І там сямым няблага зараблялі.

Сёння такім турфірмам пастаўлена заслона. У выпадку выкрыцця факту падману з такімі партнёрамі консульскі аддзел назаўсёды спыняе супрацоўніцтва. Консулы падкрэслілі, што віза атрыманая самастойна, будзе каштаваць значна менш, чым з дапамогай турфірмы.

У студзені г.г. спрошчаная практыка атрымання візы. У выніку знікла адна чарга да акенца так званага першага кантакту. Цяпер кожны можа прыйсці ў будныя дні ў візавы аддзел з пашпартам з 14 гадзін да палоўы 17-й, зарэгістравацца, атрымаць (калі трэба) кансультацыю і праз пэўны нядоўгі тэрмін атрымаць візу. На летні перыяд мяркуецца павялічыць колькасць супрацоўнікаў консульства ў Мінску. Гэтыя і іншыя захады, мяркуецца, зменшаць колькасць людзей у чэргах.

Для тых, хто вельмі спяшаецца ў Польшчу, выкарыстоўваецца паскораная выдача так званай экспрэс-візы — літаральна на працягу сутак. Праўда, за такую паслугу прадугледжваецца павышаны консульскі збор.

Паводле слоў Міхала Грачылы, Польшча як член Еўрасаюза, безумоўна, у наступным годзе далучыцца да краін шэнгенскай зоны.

Візавыя клопаты — гэта расходы для грамадзян. У тым ліку і на набыццё медыцынскай страхоўкі. Пакуль не наўнасць не патрабуецца пры ўездзе ў Польшчу. Аднак Міхал Грачыла вельмі настойліва раіў усёж такую страхоўку, бо ляўчэй ў Польшчы зусім не таннае.

Яшчэ консул рэкамендаваў пры наведванні консульства не браць з сабой прадметы, так бы мовіць, двайнога прызначэння. Паводле яго слоў, асобныя нашы грамадзяне незразумела навошта прыносяць з сабой вялікія нажы, нажніцы, пілы і іншыя небяспечныя, на погляд дыпламатаў, рэчы. Яны не маюць аніякіх адносінаў да мірнага працэсу атрымання візы і толькі даюць дадатковую працу для аховы.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

## Пілінг, клінінг, пляценне дрэдаў і заказ праз Інтэрнэт...

### ...ПРАПАНУЕ СЁННЯ АЙЧЫННАЯ СФЕРА БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАННЯ

**У мінулым годзе ў краіне быў адкрыты 101 новы комплексны прыёмны пункт, у тым ліку 71 — у аграгарадках. Адрамантавана 499. Усяго на 1 студзеня 2007 года ў краіне функцыянаваў 1761 сельскі КПП (адзін пункт на 1528 вяскоўцаў).**

У кожным КПП сёння прымаюцца заяўкі па 11 відах сацыяльна значных бытавых паслугах, па чатырох з іх (рамонт абутку і вопраткі, паслугі цырульніка і продаж рытуальных паслуг) абслугоўванне аказваецца на месцы.

Паводле слоў генеральнага дырэктара Дзяржаўнага аб'яднання «Белбыт» Ганны Лаўрукевіч, летась было праведзена тэхнічнае пераўзбраенне арганізацый галіны, у тым ліку тых, якія аказваюць паслугі насельніцтву ў сельскай мясцовасці і маюць статус КПП, за кошт сродкаў рэспубліканскага, мясцовых бюджэтаў, уласных сродкаў арганізацый і інавацыйнага фонду Міністэрства гандлю на суму каля 10 млрд рублёў.

Увогуле, у арганізацыях «Белбыта» летась былі распрацаваны і атрымалі ўкараненне 1500 новых узораў і мадэляў мэблі, абутку, галаўных убораў, швейных, трыкатажных, ювелірных вырабаў, новых мадэляў стрыжак і прычосак, вырабаў рытуальнай атрыбутыкі. Акрамя таго, супрацоўнікі галіны ўкаранілі 55 новых відаў і формаў бытавога абслугоўвання, сярод іх: рамонт складаной бытавой тэхнікі новага пакалення (СВ-печак, пральных машын, пыласосаў), рамонт мэблі са зменненем дызайну, чыстка вырабаў з новых тэкстыльных матэрыялаў і скур, намазное фарбаванне пушніны, таніраванне дэталяў аздаблення з натуральнага футра. Прапануюць беларускія «бытавікі» паслугі лічбавага фота, рамонт газонакасілак і трымераў айчыннай і імпартнай вытворчасці, мастацкую шпатлю вырабаў. А таксама і зусім новыя паслугі, напрыклад, зняцце пілінга з вопраткі (пазбаўленне ад «катышкаў»), клінінг (тэрміновая ўборка памяшкання), пляценне дрэдаў (косак), рамонт і аднаўленне пазногцяў, дэкаратыўны манікюр.

Доля дзяржаўных арганізацый, якія сёння аказваюць бытавыя паслугі насельніцтву, не перавышае 20 працэнтаў. Прычым большасць «прыватнікаў» канцэнтруецца ў сталіцы і абласных гарадах. Для таго, каб абараніць спажыўца ад магчымых парушэнняў іх правоў, Ганна Мікалаеўна паабяцала, што сёлета працягнецца працэс сертыфікацыі на найбольш запатрабаваныя і прыбытковыя віды бытавых паслуг: вытворчасць мэблі пад заказ і аўтасэрвіс, дзе было выяўлена шмат парушэнняў. Падобную сертыфікацыю ўжо атрымалі цырульні, некаторыя хімчысткі і пральні.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

## НАШ АДКАЗ — ЛЁН І РАПС?

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

### Выпуск унікальнага айчыннага алею адкладзены. З-за фінансавых цяжкасцяў

**Сакрэт здароўя — збалансаванае харчаванне. Гэтае сцвярджэнне ніхто, напэўна, не будзе аспрэчваць. Паколькі добра вядома, што чым больш разнастайны рацыён, тым больш поўны комплекс неабходных рэчываў атрымлівае наш арганізм. Любы прадукт — пэўны комплекс тых ці іншых карысных кампанентаў. Алеі перш за ўсё з'яўляюцца крыніцай тлушчаў, у склад якіх у сваю чаргу ўваходзяць адпаведныя кіслоты. Сярод іх ёсць і незаменныя — тыя, што не могуць выпрацоўвацца арганізмам чалавека. Між тым, яны адыгрываюць важную ролю ў многіх працэсах на клетачным узроўні.**

Найбольш «раскручаны» сярод спажыўцоў аліўкавы алей. Але, як вядома, аліўкі ў Беларусі не растуць, таму адпаведную прадукцыю завозяць з-за мяжы і яе кошт даволі адчувальны для кашалька. Аднак, як аказалася, прадукту можна знайсці годную замену. Напрыклад, у выглядзе рапсавага алею, які, дарэчы, апошнім часам імкліва набірае папулярнасць. Прычынай таму — яго характарыстыкі. Уся справа ў тым, што па тлушчаваму складу рапсавы алей падобны на аліўкавы. У ім утрымліваецца аптымальная колькасць лінолевай кіслаты, якая незаменная ў многіх працэсах — ад клетачнага абмену да разбурэння халестэрыну і падтрымання ахоўных сіл арганізма. А алеінавая кіслата забяспечвае добрую спажыўнасць. Прызнана, што рапсавы алей больш эканамічны, паколькі падчас прыгатавання ежы ён менш усмоктваецца ў прадукты. Не менш прывабным для спажыўцоў з'яўляецца і кошт.

Другая традыцыйная для беларусаў культура — лён. Акрамя ўсяго іншага, з яго атрымліваюць і харчовы алей. Па сваёй біялагічнай каштоўнасці ён першы сярод адпаведных прадуктаў. Як вынікае з навуковых распрацовак, семя лёну ўтрымлівае 46 працэнтаў вітаміну F, які не сінтэзуецца ў арганізме. У склад яго ўваходзяць каштоўныя поліненасычаныя кіслоты (лінолевая і альфа-лінолевая). Таму льняны алей лічыцца гаючым сродкам, універсальным у барацьбе з шэрагам хвароб. Гэты прадукт «падтрымлівае» мозг, дабратворна ўплывае на нервовую сістэму, а таксама змяншае ўзровень халестэрыну, нармалізуе функцыі страўніка і кішэчніка, паляпшае стан скуры. Льняны алей рэкамендуецца для прафілактыкі парушэння тлушчавага абмену, атэрасклерозу і як агульнаўмацавальны сродак (асабліва карысны пасляаперацыйным аслабленым пацыентам). Карысны ён і для дзіцячага арганізма.

Аднак трэба мець на ўвазе тое, што прафілактычны і гаючы эфект мае льняны алей, які атрыманы метадам халоднага адціскання. Толькі ў такім выпадку ён характарызуецца высокім утрыманнем ненасычаных тлушчавых кіслот і вітамінаў. Масла лёгка акісляецца, таму неабходна зберагаць яго ад уздзеяння святла і паветра. Калі ўсе гэтыя патрабаванні выкананы, то льняны алей можна лічыць сапраўдным эліксірам маладосці. Яго рэкамендуецца дадаваць у гатовыя гарачыя і халодныя стравы. У лячэбных мэтах неабходна яго прымаць па 1—2 сталовыя лыжкі 2—3 разы на дзень на працягу некалькіх месяцаў.

Так што «наш адказ» у выглядзе льнянога і рапсавага алею выглядае даволі пераканаўча. Толькі ці ўдасца яго ўвасобіць у жыццё і прапанаваць спажыўцам адпаведную прадукцыю айчыннай вытворчасці? Наконт рапсавага алею сумненняў не ўзнікае — яго выпуск наладжаны некалькімі беларускімі прадпрыемствамі. У тым ліку і адкрытым акцыянерным таварыствам «Рапс», што ў Мінскім раёне. На думку першага намесніка старшыні Мінскага райвыканкама Генадзя Судзянкова, прадпрыемствы перапрацоўкі актыўна праводзяць тэхнічную мадэрнізацыю, нарошчваюць паказчыкі. Не стала выключэннем і ААТ «Рапс» — на працягу мінулага года аб'ём вытворчасці тут быў павялічаны ўдвая. На прадпрыемстве перапрацавана 18 тысяч тон насення алейных культур. У тым ліку і рапсу. Сыравіна сюды пастаўляецца з усіх куткоў Мінскай вобласці.

На прадпрыемстве гатовы прыступіць і да выпуску льнянога алею. Аднак тут узнікаюць цяжкасці.

— Льняны алей — сапраўды ўнікальны прадукт, яшчэ і таму, што ён у тым ліку здольны выводзіць з арганізма чалавека радыенукліды, — кажа дырэктар ААТ «Рапс» Міхаіл Ламака. — Для нашай краіны гэта надзвычай актуальна. Беларускім медыцынскім універсітэтам распрацавана тэхналогія выпуску, былі зроблены і вопытныя ўзоры. Праводзіліся нават клінічныя выпрабаванні. Можна з упэўненасцю казаць пра тое, што айчынны льняны алей па якасці пераўзыходзіць замежныя аналагі. У адпаведнай прадукцыі будуць большыя тэрміны захоўвання. Аднак выпуск пакуль адкладзены на няпэўную перспектыву, паколькі ў нас няма неабходных для гэтага сродкаў.

У такой сітуацыі застаецца хіба што развесці рукамі — ёсць усе падставы для таго, каб «запусціць» выгадную для вытворцы і спажыўцоў справу, аднак яна спынілася, так і не пачаўшыся.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
*Мінскі раён.*


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
**Прасаўшчык Аляксандр ДУШКОВІЧ.**


**Начальнік асноўнай вытворчасці Людміла ЯШНОЎСКАЯ.**

## ЭКАНОМІЦЬ НАВУЧАЦЬ ЛІЧЫЛЬНІКІ

**У кватэрах мінчан неабходна ўстанавіць прыборы ўліку спажывання абсалютна ўсіх энергарэсурсаў. Такая задача пастаўлена перад горадам кіраўніком дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам, паведаміў на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме мэр сталіцы Міхаіл Паўлаў.**

Старшыня Мінгарвыканкама даручыў кіраўнікам Галоўнага вытворчага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі і вытворчага аб'яднання «Мінскводаканал» знайсці шляхі рэалізацыі даручэння Прэзідэнта. Мэр таксама адзначыў, што прыборы ўліку плануецца ўстанаўліваць не толькі за кошт насельніцтва. На лічыльнікі для асобных катэгорый мінчан сродкі будуць выдзелены з гарадскога бюджэту.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».**

# 400 І ДЗЕСЯЦЬ ТЫСЯЧ

**Каля чатырох соцень новых кніг прадстаўлена на выставе «Дні Яўрэйскай Кнігі», якая адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Побач з імі экспануецца таксама частка ўласнай бібліятэчнай калекцыі, якая налічвае каля 10 тысяч выданняў на ідыш і іўрыце XVII—XXI стагоддзяў.**

Падобныя выставы праходзяць у Мінску не першы год, але гэта — асаблівая. Не толькі таму, што арганізавалі яе пасольства Дзяржавы Ізраіль, Нацыянальная бібліятэка і выдавецтва «МЕТ» пры падтрымцы яўрэйскіх арганізацый «Джойнт» і «Сахнут». У адрозненне ад абшчынных, гэта экспазіцыя прадстаўляе літаратуру асобных выдавецтваў: ізраільскіх, расійскіх і беларускіх (усяго амаль 30-ці), прычым усю, якая датычыцца яўрэйскай тэматыкі. Акрамя таго, да сёлетняй выставы прымеркаваны яшчэ дзве падзеі: фотаэкспазіцыя «Пераводныя карцінкі» знакамітых ізраільскіх фатографаў Юліі Камісараф і Давіда Дэктара і прэзентацыя першай кнігі ізраільскага пісьменніка ў перакладзе на беларускую мову — зборніка Этгара Керэта «Кіроўца аўтобуса, які хацеў стаць богам».

— Кніга, з усіх формаў культурнага самавыяўлення, несумненна, была заўжды бліжэй за ўсё да яўрэйскага народа, — сказаў на адкрыцці «Дзён» Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Дзяржавы Ізраіль у Беларусі Зееў Бэн-Ар'е. — Добра, што выстава праходзіць у Беларусі, дзе яўрэйская кніга і яўрэйская літаратура ўвогуле — не экзатычныя дзівосы, а прадукт творчасці народа, з якім беларусы жылі стагоддзямі побач.

Пасол паведаміў, што частка экспазіцыі будзе перададзена ў дар Нацыянальнай бібліятэцы.

— Кнігавыданне — вельмі значны набытак для нашай краіны, — нагадала пасля слоў ўдзячнасці ізраільскаму пасольству першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч. — Толькі ў мінулым годзе было выдадзена звыш 11 з паловай тысяч назваў кніг агульным накладам звыш 53 мільёнаў экзэмпляраў. Гэта — вялікае дасягненне краіны, якая рушыць наперад, будуе сваю незалежнасць у супольнасці з братнімі народамі, з тымі народамі, якія адвеку насялялі нашу мужную, прыгожую Беларусь.

Намеснік дырэктара беларускага выдавецтва «МЕТ» Ганна Фрыдман патлумачыла, чаму, на яе думку, патрэбны такія выставы:

— Мой дзед падчас Другой сусветнай вайны абараняў нашу краіну — Беларусь, зараз ён жыве ў Ізраілі. Мой брат, грамадзянін Ізраіля, служыў у Ізраільскай арміі і абараняў Ізраіль, зараз ён ажаніўся і жыве ў Мінску. Я думаю, што ў многіх з прысутных ёсць сваякі як у Ізраілі, так і ў Беларусі. Вось чаму так важна дасягнуць узаемаразумення паміж нашымі народамі.

Выдавецтва «МЕТ» робіць крокі ў дадзеным напрамку: друкуе ізраільскіх аўтараў, а таксама аўтараў, якія пішуць на яўрэйскую тэматыку. Адна з такіх кніг вядомага ізраільскага паэта Рэнаты Мухі «Однажды, а может быть, дважды», праілюстраваная беларускім мастаком Таццянай Сучковай, атрымала ў 2005 годзе прэмію імя Францыска Скарыны за афармленне і дыплом першай ступені на міжнародным кніжным кірмашы.

Выстава будзе працаваць да 4 лютага.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
**Намеснік дырэктара беларускага выдавецтва «МЕТ» Ганна ФРЫДМАН ведае, для чаго Беларусі патрэбны яўрэйскія кнігі.**

**«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41**

## Адпускныя выплацяць праз некалькі дзён

**«Мой муж Мікалай Аляксандравіч працуе механізатарам у прыватным унітарным прадпрыемстве «Профітагра». З 13 студзеня знаходзіцца ў водпуску. Пайшла за яго атрымліваць грошы, а адпускныя яму не налічылі, кажуць, выдадуць разам з зарплатай за студзень. Калі гэта будзе? У мужа тады і водпуск скончыцца. А ў нас былі запланаваныя паездкі, пакупкі. Ды і як так увогуле магло атрымацца, калі, згодна з заканадаўствам, разлічыцца з чалавекам павінны своечасова?» З такой скаргай у рэдакцыю звярнулася жыхарка вёскі Церабуты Старадарожскага раёна Галіна Іванаўна Асенчык.**

— З фінансамі гэта накладка ніяк не звязана. Заработную плату работнікам мы выдаём своечасова, без затрымак, — адразу запэўніла нас галоўны бухгалтар «Профітагра» Наталля Русаковіч. — Справа, відаць, у наступным. Работнік аддзела кадраў па сямейных абставінах колькі часу таму пайшла ў водпуск. Напэўна, таму не паспела афарміць і перадаць нам выпіску з загада для налічэння гэтаму механізатару грошай. Асабіста я, скажам, увогуле не ведала, што гэты работнік знаходзіцца ў водпуску.

Як паведаміла далей Наталля Рыгораўна, літаральна днямі работнік аддзела кадраў выходзіць на працу. Яна адразу падрыхтуе ўсе патрэбныя дакументы і літаральна праз дзень — два пасля гэтага механізатару выплацяць належныя сродкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ОАО «Барановичидрев»

уведомляет своих акционеров о проведении 1 марта 2007 года очередного общего собрания акционеров

**Повестка дня:**

1. Об итогах работы Общества в 2006 году и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2007 год.
2. Рассмотрение бухгалтерского баланса и направлений использования нераспределенной прибыли за 2006 год. Утверждение порядка выплаты и размера дивидендов за 2006 год.
3. Установление норматива распределения нераспределенной прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2007 год и I квартал 2008 г.
4. Отчет Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии о деятельности в 2006 году.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. Утверждение Устава Общества в новой редакции.

**Собрание состоится по адресу:
г. Барановичи, пос. Восточный, 3,
клуб ОАО «Барановичидрев». Начало в 14.00.**

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни в период с 22 февраля 2007 года — с 9.00 до 17.00 (перерыв с 12.30 до 13.30) в здании заводоуправления, каб. 9, 10, а в день проведения собрания — в месте проведения собрания с 13.00. Регистрация участников собрания будет проводиться с 13 часов до 13 часов 50 минут по месту проведения собрания при предъявлении документов, удостоверяющих личность.

## Уважаемые акционеры ОАО «Технобанк»!

Настоящим извещаем о проведении внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «Технобанк» в **очной форме**.

**Дата проведения: 07 февраля 2007 года.
Место проведения: актовый зал РУП «Белгипроводхоз» по адресу: г. Минск, пр. Машерова, д. 25, 2-й этаж.
Регистрация участников общества для участия в собрании: с 10.00 до 11.00.
Время проведения заседания: с 11.00 до 13.00.
Повестка дня Общего собрания акционеров:**

1. О вычленении (разделе) поэтажно здания (изолированных помещений) ОАО «Технобанк», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, д. 44.
2. О залоге вычлененного (разделенного) поэтажно здания (изолированных помещений) ОАО «Технобанк» или здания ОАО «Технобанк», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, д. 44.
3. О переоценке имущества ОАО «Технобанк» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь «О вопросах переоценки основных средств, не завершенных строительством объектов и неустановленного оборудования» от 20 октября 2006 года № 622.
4. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
5. О порядке доведения решений, принятых на внеочередном Общем собрании акционеров ОАО «Технобанк» 07 февраля 2007г., до сведения его участников.

Для регистрации с собой необходимо иметь: паспорт (для физических лиц), удостоверение руководителя и печать (для юридических лиц) либо иной документ, подтверждающий полномочия!!!

Для получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:

**г. Минск, ул. Кропоткина, 44,**
телефон (017) 237 43 80

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г.

## БЕЛАРУСБАНК

АСБ «Беларусбанк» информирует,
что с 1 февраля 2007 года изменились условия
предоставления кредитов физическим лицам
на потребительские нужды
в белорусских рублях и в иностранной валюте.
Более подробную информацию относительно
получения кредитов и оказания банком других
услуг можно получить в любом учреждении
АСБ «Беларусбанк» или на веб-сайте банка
**www.belarus-bank.by**.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

В опубликованном в газете «Звязда» 30.01.2007 г. извещении о продаже части двухэтажного здания в г. Копыле вносятся изменения: Аукцион состоится 06.03.2007 г. в 15.00. Заявления на участие принимаются по 05.03.2007 г.

У суд Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **ШАЎЧУКА Алега Мікалаевіча**, 29 сакавіка 1961 года нараджэння, ураджэнца в. Леановічы Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці, апошняе месца жыхарства — Брэсцкая вобл., г. Ганцавічы, вул. Будаўнікоў, д. 47, кв. 5. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра А.М. Шаўчука, паведаміць іх суду Ганцавіцкага раёна па адрасу: 225432 г. Ганцавічы, вул. Камуністычная, д. 21 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым грамадзяніна **ЮРКОВА Аляксандра Уладзіміравіча**, 25.12.1967 года нараджэння, ураджэнца в. Бароўка Касцюковіцкага раёна, які пражываў па адрасу: г. Касцюковічы, м-н Маладзёжны, д. 9, кв. 35, апошняе месца жыхарства і знаходжання ў 2000 годзе — г. Касцюковічы Магілёўскай вобласці.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна А.У. Юркова, паведаміць іх суду Касцюковіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**Простая мова**

# ДВАЦЦАЦЬ ГОД ПАСЛЯ

**...Адным радком, для памяці:**

**— О-о, нарэшце! Дачакаліся — Калядныя маразы! — пачула ранічкай пасля Вадохрышча і ўбачыла: на тэрмометры... мінус адзін.**

**Гадоў праз 20 ніхто, відаць, не паверыць, што зімой дзве тысячы шостага-сёмага — ні халадоў, ні снегу не было. Змрок. Аж да канца студзеня.**

### На добрых руках

Татка, татачка — гэта гордае званне Ромік носіць нядаўна і цалкам заслужана, бо першынца свайго ну вельмі чакаў, дапамагаў яму з'явіцца на свет, а ўжо потым — і купаў, і спавіваў, і карміў, і калыхаў... Крэўнікі яны, адзін без другога — проста дыхаць не могуць.

А даводзіцца — бо бацьку ж трэба на працу, трэба па справах ці горш яшчэ — у камандзіроўкі...

Падчас адной з іх на вакзале ён хлопчыка ўбачыў (той на падлозе сядзеў) — аж сэрца зайшлося: дзе бацькі, маўляў, куды глядзяць?!

І дзіцятка на рукі... Падхапіў, азірнуўся і толькі тут апомніўся, што не дома ён — у Гамбургу, што дзіцяці — нішто не пагражае: падлога, прынамсі, тут чысцейшая, чым на асобнай кухні.

...Паставіў на яе малога, папрасіў прабачэння... На руска-нямецкай... Бацькі — усё зразумелі. Ды і само дзіця... Ветла ўсміхалася — яму, як свайму. І сваё.

### Каб ведаць...

Сялібка тая і сёння стаіць — па-ранейшаму пустая, ля самай шашы — але цяпер, так бы мовіць, моўчкі.

Тады ж, перад ёй, вялізазны белы шчыт красаваўся з яркім, чырвоным: «Продаётся дом!».

Калега-фотакор яго зняў (разам з абвесткай), да здымка неяк самі сабой зляжыліся радкі:

*Што было —*
*таго не будзе зноў.*
*І жыццё — гадзінай...*
*Белым сцягам*
*«Прадаецца дом»...*
*Ды ці дом? Радзіма...*

«Фотаслова» гэта выйшла ў газеце. А ледзь не назаўтра ў рэдакцыю пазваніў гаспадар, сказаў: я ў суд падам... Вы напісалі, што я радзіму прадаю, а я — не прадацель...

Ледзь паразумеліся.

Зрэшты, гэта так — да слова. Зараз — яно само.

Радзіму сваю (хату. Яшчэ дзедаву...) Максім даўно прадаваў і з усім нажытым — з вялікім садам і калодзежам, з хлеўчукамі, лазняй, мэбляй, посудам. Адзінае — перабраў усё. Больш-менш каштоўнае — забраў сабе, аддаў суседзям. На гарышча сігануў — нанешта скінуў адтуль старыя скрынкі для яблыкаў, зжаўцелыя школьныя падручнікі, ахапак рызззя. А пад ім, ля коміна... Божухна, аж сэрца зайшлося — гаршчок... Зверху заліты глінай...

Пакуль спускаўся з гарышча (на дрыжачых ад нагах), — чаго ні перадумаў...

Назіркам (на ўсякі выпадак) зайшоў за хляўчук, — разбіў «накрыўку». Пад ёй былі пісьмы, нейкія паперы, віншавальныя паштоўкі... На канвертах пазнаў — ад цёткі з Данбаса, ад дзядзькі з Канады, ад стрыечнай сястры...

Асцярожна, па паперынцы, ён вымаў іх з пасудзіны, абмацваў кожны канверцік — нічога (у сэнсе каштоўнага).

Ад злосці садануў ботам па гаршку, закурыў, кінуў запалку, паглядзеў, як ліха ўсё загарэлася і пасмяяўся... З сябе, бо думаў жа золата, скарб!

Як у ваду глядзеў, калі думаў: праз трыццаць гадоў у газеце абвестку ўбачыў: з мэтай атрымання спадчыны ў Канадзе, расшукваецца радня... таго самага дзядзькі. Як быццам...

З усёй той радні ён застаўся адзін, але ж на руках — ніякай зачэпкі: ні адраса, ні фотакарткі, ні дакладнага імя, ні звестак пра сям'ю... Нічога.

І, галоўнае, каб іх не было... А то спаліў — уласнымі рукамі.

### Што такое цяжка

Яны любілі адно аднаго і пачуццяў сваіх не хавалі. Навошта (самі казалі), калі ён без пяці хвілін плітачнік-мазаічнік і ёй — засталося экзамены здаць: школа закончана.

Вось толькі армія...

«Касіць» ад яе ён не збіраўся, служыў недалёка, больш за тое — праз паўгода — у водпуск прыехаў. Распісаліся, вечар зрабілі... І зацяжарала яна акурат тады ж, хоць жаніха ў той прыезд цвярозым ніхто не ўбачыў.

— Паспяшаліся вы... Навошта? — пыталі ў яе сяброўкі. — Можна ж было пачакаць.

— Ага... Вам лёгка казаць, — ганарылася маладзічка, — а чакаць — знаеце, як цяжка. Ды і зачэм?.. Зра ўрэмя ціраць... Пака ён вярнёцца, я сына раджу.

Нарадзіла... Калеку...

Але гадуе — у добрае надвор'е возіць яго па вуліцы (у закрытым вазку). І расказвае (ледзь не кожнаму), як жа гэта не-вынос-на цяж-ка — расціць дзіця-інваліда.

...Куды цяжэй, трэба разумець, чым чакаць. Пакуль муж адслужыць. Ці хаця б праспіцца.

### У змроку

Калідоры ўлады... Раённага, не высокага рангу. Таму, відаць, — шэрыя, абадраныя, з пратаптаным ля дзвярэй лінолеумам, з высокай, заклеенай скотчам шафай, з дабітым сталом і крэсламі.

Але ж пры гэтым — з тонкім пахам парфумы, якую маладзічкі (а ўжо дзелавыя, гордыя сабой...) разам з нейкімі паперамі носяць з кабінета ў кабінет, з начальнікам, што пайшоў на пяцімінутку і праз паўгадзіны яшчэ не вярнуўся, з заўсёднай, напэўна, групай «чакальнікаў».

...У той дзень яна раздзялілася: мужыкі, заняўшы чаргу, моўчкі, па асобку, стаялі, смалілі на вуліцы, бабы — наадварот — шчаміліся сесці, кучкаваліся вакол стала, дзе расказвалі — адна адной, а значыць, і ўсім — хто якую даведку дзе браў, колькі плаціў, куды яе потым нёс. Агульныя ж справы, можна сказаць: адна з кабет — мелася жыллё будаваць, афармляла крэдыт, другая — дакументы на гараж, трэцяя — на дом, што застаўся ад маці... Тая, бедная, увосень памерла. «Буракі церабіла... Ля студні сагнулася, каб гумовікі памыць і...»

— От добра табе, — каментуе гэта гора «кабета з гаражом». — А мая — дык каторы год хварэе і цягаецца ўсё. Прычапілася: «Не магу адна, забяры. Ну хоць на зіму... Я на цябе гараж апішу...» «Ат, думаю, халера з ім — забяру, хай жыве. Пенсія ў яе вялікая... Перавезла. Вечарам вады ў ванну наліла, пасадзіла... Пакупалася яна, а далей — ніяк: і сама не вылезе, і я не падыму. Хоць МНС выклікай. Ведама — старое... Цяжкая, як гліна... Дык я на тэлефон, брату званю. Кажу: «Забірай!.. Не трэба мне — ні яе, ні тых грошай»... А што — хай ён дагледае. Такі ж самы сваяк, як і я...

Бы рыба на беразе, «захапа́ла» паветра, «жанчына з домам» — заплакала, ускочыла з месца, кінулася вон.

...На крэсла яе ніхто больш не сеў: «абмен вопытам» скончыўся — над шэрым абадраным калідорам павісла цішыня — гэткая ж шэрая.

### Навіна

У тралейбусе (тварам у салон) мужчынка сядзіць. З разгорнутай газетай: апошнюю старонку чытае. А на першай — каравул... Літары — з аршын, ды яркія, чырвоныя: «Маці хацела прадаць малодшага сына».

Сенсацыя? Так. Навіна? Канешне...

Бо (як ні дзіка гэта гучыць) тым, што хацела забіць ці нават забіла, нікога цяпер не здзівіш.

### «За што змагаліся...»

...Дом ён ставіў цвяроза, а значыць, самы звычайны — невялічкі, цёплы, пад надзейным жалезным дахам, а вось ужо плот...

— Ці не здурнеў, суседзе? — пыталі вяскоўцы. — Табе што — няма дзе дошкі дзяваць?

— Ды ўжо ж... Засталіся... То няхай хоць плотам паслужаць, — казаў гаспадар і ляпіў іх — высозныя — адна пры адной: камар носа не падточыць.

«Кожны па-свойму з глузду з'язджае», — паставілі «дыягназ» вяскоўцы, і хутка забыліся б, калі б за тым плотам усё добра ішло. Дык не ж... То сярод тыдня свята заложаць — ад песень (да ранку) аж шыбы звіняць, то потым б'юцца між сабой, і дзіця ад плачу заходзіцца... То, зноў жа скаціну шкада — хлеў разносіць — галодная...

І нічога не зробіш — плот... І не скажаш... «Адмазка» адна: «Як хочам так і жывём. Вас не датычыцца».

Калі б і насамрэч, — хто б іх, дурняў, чапаў, але ж... «Часу не мелі» сена накасіць (карову прадалі, грошы прапілі), увесну з-за п'янак «не выпала» бульбу пасадзіць, нейкай збажыны пасеяць — апошнюю курыцу засеклі. Убачылі, што без патрэбы хлявы — сталі разбіраць, на дровы. І (голад не дзя́дзіна...) у тых жа вяскоўцаў — красці пакрысе...

А потым, напіўшыся, падпалілі хату.

...Ветру не было, — таму тушыць агонь ніхто (апроч пажарных) не кінуўся. Шкадаваць, а тым больш памагаць пагарэльцам — таксама: «за што змагаліся...»

### Без дай прычыны

Лепшага сябра, чым сын, у яе не было — ні тады, калі ў садок хадзіў, ні потым, калі вырас, паступіў вучыцца. Разам яны рабілі ўсё — чыталі кніжкі, мылі падлогі, каталіся на веласіпедах і каньках, хадзілі на рынак, ездзілі ў лес, «чаравалі» на кухні. Толькі там «падзел» ужо быў: у сына лепш прысмакі выходзілі, у яе — нешта паўсядзённае: бліны, булёны, катлеты. А ўжо як капустка (квашаная) ды з баравічкамі — свята: сын ад'есціся не мог, казаў, што, каб смачней, то нічога ў свеце няма і нават быць не можа...

Ён ажаніўся нядаўна, у дом нявестку прывёў. Грэх скардзіцца — харошае дзяўчо — прыветлівае, добрае. На работу ходзіць, завочна — вучыцца, за парадкам глядзіць, гатаваць умее (сталавацца яны асобна рашылі). А маці — усё роўна крыўдна.

Трэцяга дня выхадны ў яе быў. Спецыяльна паехала на Камароўку, купіла баравічкоў (сушаных): сынок яе на парог (нявестка ў другой змене была), а яна — міску на стол. З фірменнай капустачкай — садзіся, паеш...

І той — загарэўся быў... А потым — не. Уздыхнуў і кажа: «Прабач, мама, я буду есці тое, што мне Іра зварыла».

...Не, не любяць свякрухі нявестак.

Як правіла...

Ці не таму, што іх — любяць сыны?

(Калі тое ж — прыказкай, то «усякая смерць прычыну знойдзе»).

### Дваццаць год пасля

На вясковы сметнік занесла... Жуткае відовішча... Ну, па-першае, лепшай долі быў варты той кавалак зямлі. А далей...

Ля «ўваходу», на раз'езджанай чорнай зямлі ружавела бязногая голая лялька, крыху паводдаль, на кузаве старога «Масквіча», узвышалася вялізнае, разламанае крэсла, над адной з куч узвышаліся крыжы, матляліся яшчэ чорныя, жалобныя ленты, у другой валяліся... кнігі. У брудных размоклых вокладках, з безнадзейна ўчарнелымі старонкамі — творы Ніліна, По, Шагінян, Кятлінскай, «Амерыканская трагедыя» Драйзера, Фехтвангер, Дзюма «Двадцать лет спустя»...

А яно ж і насамрэч — прыкладна 20... З тых часоў, як мы (ці не ўсе?) проста вар'яцелі на кніжках — шукалі нейкія знаёмствы, збіралі макулатуру і рыззё, з ночы займалі чэргі. І ўсё — каб нешта дастаць, купіць.

Купіўшы, многія — і тады, і цяпер — чыталі. І чытаюць. Большасць жа, хацела проста не адстаць, «урваць» і за шкло паставіць.

Бо калі б чытала...

Можа памыляюся, але здаецца, што не было б тады гэтай кучы.

Не было б бязногай голай лялькі. І крыжоў. Над сметнікам.

**Валянціна ДОЎНАР.**

